# 18 снежня дырэктар Полацкага ЦСМС наведаў Абласны адукацыйны форум "Энергапогляд"

18 снежня дырэктар Полацкага ЦСМС наведаў Абласны адукацыйны форум "Энергапогляд".
На гэтым мерапрыемстве навучэнцы ўстаноў адукацыі вобласці прадставілі свае ідэі па стварэнню энергаэфектыўнай будучыні. Калі знойдуцца спонсары і інвестары, то гарады і кватэры са штучным інтэлектам на службе ў людзей стануць рэальнасцю!
Гасцям форуму, сярод якіх быў намеснік старшыні Дзяржстандарта Віталь Крэцкі, асабліва спадабаліся маладзёжныя праекты. Віталь Крэцкі адзначыў, што ўдзел школьнікаў і прадстаўнікоў прадпрыемстваў рэальнага сектара эканомікі дае магчымасць убачыць, наколькі шмат таленавітых дзяцей гатовы генераваць ідэі, якія чакаюць увасаблення.
Праца па павышэнні энергаэфектыўнасці ў адукацыйных установах і ўцягнутасць настаўнікаў і вучняў выклікаюць упэўненасць у тым, што такія каштоўнасці, як энергазберажэнне і інавацыі, стануць ладам жыцця для маладога пакалення.
Эфектыўнасць энергазберажэння напрамую ўплывае на сацыяльна-эканамічнае развіццё краіны.
На дыялогавай пляцоўцы "100 пытанняў да дарослага" з навучэнцамі размаўляў генеральны дырэктар РУП "Віцебскэнерга" Сяргей Шыдлоўскі. Ён падзяліўся сваім досведам вучобы і прафесійнага росту, падкрэсліўшы важнасць выбару мэты і ўпэўненага руху да яе. І цудоўна, калі агульнай мэтай стане энергаэфектыўнасць!
На форуме «Энергапогляд» мноства лакацый, дзе кожны можа знайсці нешта новае і цікавае. Дзякуй арганізатарам: галоўнаму ўпраўленню па адукацыі аблвыканкама, абласному ўпраўленню па наглядзе за рацыянальным выкарыстаннем паліўна-энергетычных рэсурсаў і Віцебскаму абласному інстытуту развіцця адукацыі.